9(476)(075.8)
З-121

М.М. Забаўскі
А.Ф. Рацько

# Буржуазныя рэформы ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.






Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

М. М. Забаўскі, А. Ф. Рацько

# БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

Мінск 2004

УДК 947.6(0758)
ББК 63.3(2)5(4Бел)я73
З12

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ
Рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 4 ад 27.10.03 г.)

*Рэцэнзенты:*
кафедра гісторыі Беларусі БДПУ;
У. В. Тугай, доктар гістарычных навук, прафесар

**Забаўскі М. М., Рацько А. Ф.**
З12 Буржуазныя рэформы ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.: Вучэб.-метад. дапам. — Мн., БДПУ, 2004. — 64 с.
ISBN 985-435-700-7

У дапаможніку разглядаюцца пытанні буржуазных рэформ сярэдзіны XIX — пачатку XX ст. Прапануюцца пытанні і заданні да кожнага раздзела. Прадстаўлены дакументальныя матэрыялы, змешчаныя ў дадатку.

Адрасуецца студэнтам, выкладчыкам БДПУ і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі XIX — XX стст.

**УДК 947.6(0758)**
**ББК 63.3(2)5(4Бел)я73**

ISBN 985-435-700-7

© М. М. Забаўскі, А. Ф. Рацько, 2004
© ВВЦ БДПУ, 2004

## УСТУП

Рэформы — натуральныя і заканамерныя з'явы ў гістарычным працэсе, што адказваюць на пытанні, якія наспелі ў грамадстве і патрабуюць свайго вырашэння. У адрозненне ад рэвалюцый, якія разбураюць старыя адносіны, знішчаюць класы і партыі, дзяржаўныя і грамадскія інстытуты, царкву і мараль, прыносяць узрушэнне ў жыццё соцень і мільёнаў простых людзей, робячы з адных палачоў, а з другіх — іх ахвяр, рэформы праводзяцца па магчымасці пастулова, «мякка», без моцнага хвалявання грамадства.

Асаблівасць пераходу Расіі ад феадалізму да капіталізму ў тым, што адбываўся ён без буржуазнай рэвалюцыі, а праз шэраг буржуазных рэформ сярэдзіны XIX — пачатку XX ст. (аграрныя, культурна-адукацыйныя, палітычныя). Нягледзячы на тое што былі яны непаслядоўнымі, паўпрыгонніцкімі, захоўвалі шматлікія рэшткі феадалізму, усё ж карэнным чынам змянілі сацыяльны, эканамічны і палітычны лад, адкрывалі шлях да паступовага развіцця краіны ў кірунку да капіталізму.

Сярод рэформ сярэдзіны XIX ст. цэнтральнае месца адводзіцца сялянскай, якая мела дачыненне да найбольш складанага боку жыцця грамадства — сацыяльна-эканамічных адносін. Праведзеная зверху сялянская рэформа была ажыццёўлена такім чынам, што яе пераўтварэнні не адбіліся на памешчыках-прыгонніках. Пасля 1861 г. захаваліся шматлікія рэшткі феадалізму ў эканамічным і грамадска-палітычным ладзе Расіі, галоўнымі з якіх былі памешчыцкае землеўладанне і царскае самадзяржаўе. Сяляне атрымалі моцна ўрэзаныя надзелы зямлі за вялікі выкуп, захаваліся сервітуты, цераспаліца, не было ліквідавана абшчыннае землекарыстанне (ва ўсходняй частцы Беларусі). Тым не менш, важнейшы вынік гэтай рэформы — гэта атрыманне сялянамі ўласнай свабоды, права самастойна распараджацца сваім лёсам, набыццё маёмасных правоў, магчымасць памяняць саслоўны статус, атрымаць адукацыю.

Сялянская рэформа прынесла матэрыяльныя выгады не сялянам, а памешчыкам і дзяржаве. Аднак асноўная задача, пастаўленая рэформай,— знішчыць прыгоннае права — была выканана. Вёска пастулова, без грамадзянскай вайны стала на капіталістычны шлях развіцця.

Услед за адменай прыгоннага права ўрад вымушаны быў пайсці на шэраг іншых буржуазных рэформ у галіне кіравання, асветы, суда, друку, ваеннай справы. Аднак яны былі непаслядоўныя і абмежаваныя, не кранулі асноў самадзяржаўя і ў значнай ступені захоўвалі прывілеі дваранства, садзейнічалі пераўтварэнню Расійскай дзяржавы з феадальнай манархіі ў буржуазную.

У Беларусі ў сувязі з паўстаннем 1863—1864 гг. дзейнічаў рэжым выключных законаў, таму большасць рэформ 1860—1870-х гг. уводзілася тут са значным спазненнем і істотным адступленнем. Адзначым, што суд прысяжных і ў поўным аб'ёме судовыя статуты ўведзены ў Беларусі ў 1883 г., інстытут земскіх начальнікаў — толькі ў 1900 г.— у часы так званых «контррэформ», накіраваных на абмежаванне і перагляд буржуазных рэформ 1860—1870 гг. Земскае палажэнне 1890 г. наогул не было пашырана.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. падштурхнула царызм прыступіць да ліквідацыі рэштак феадалізму. Адна з іх — сталыпінская аграрная рэформа, мэта якой — стварэнне больш спрыяльных умоў для развіцця капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы. Яна ў сваёй эканамічнай частцы прывяла да росту буржуазнай уласнасці, уцягвання заможных гаспадарак у таварна-грашовыя адносіны, да росту сельскагаспадарчай вытворчасці. У сваёй палітычнай частцы рэформа паскорыла раскол вёскі і стварэнне пласта сельскай буржуазіі з ліку заможнага сялянства, забяспечыла падтрымку царскаму ўраду і на пэўны час прадухіліла сацыяльныя ўзрушэнні, «прытупіўшы» вастрыню аграрнага пытання.

Ажыццяўленне сялянскай і іншых буржуазных рэформ сярэдзіны XIX — пачатку XX ст. у Беларусі, іх спецыфічныя рысы і асаблівасці на нашых землях у сувязі з паўстаннем 1863—1864 гг., грамадска-палітычная і эканамічная сітуацыя ў заходніх губернях пасля правядзення рэформ — гэтыя і іншыя пытанні разглядаюцца ў прапануемым вучэбна-метадычным дапаможніку.

# 1. АГРАРНЫЯ РЭФОРМЫ: ВЫЗВАЛЕННЕ СЯЛЯН І ВЫРАШЭННЕ ПЫТАННЯ АБ ЗЯМЛІ

## 1.1. Падрыхтоўка адмены прыгону

***Абвастрэнне крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы.*** У канцы XVIII і асабліва ў першай палове XIX ст. феадальна-прыгонніцкая сістэма канчаткова ператварылася ў тормаз эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу. Пад ціскам рынкавага попыту ў сельскай гаспадарцы Беларусі павялічваецца колькасць прадукцыі, прызначанай на продаж. Гэта разбурала важнейшы прынцып феадалізму — панаванне натуральнай гаспадаркі. З кожным годам павялічваўся вываз сельскагаспадарчых прадуктаў у прамысловыя губерні Расіі і за мяжу. На рынак паступалі зерне, лён, каноплі, воск, лес, ільняное масла, скура і г. д. У 30 — 40-я гг. XIX ст. каля 70—80 % усіх прыбыткаў памешчыцкіх гаспадарак Гродзенскай і Мінскай губерняў паступала ад продажу галоўным чынам збожжа, гарэлкі і спірту.

Памешчыкі імкнуліся прыстасаваць сваю гаспадарку да патрэб унутранага і знешняга рынкаў, павысіць даходнасць сваіх маёнткаў. Для гэтага павялічыліся пасевы цукровых буракоў, якія ішлі на мясцовыя перапрацоўчыя заводы, разводзілі танкарунных авечак, прымянялі ўдасканаленыя прылады працы і машыны: конныя сеялкі, веялкі, малатарні, жалезныя плугі. У некаторых маёнтках пачынаюць ужываць сортнае насенне, укараняць новыя віды зерневых культур, пашыраць пасевы льну і бульбы. Аднак імкненне часткі беларускага дваранства перайці да рацыянальных метадаў вядзення гаспадаркі ва ўмовах прыгоннай працы не мела вялікага поспеху. Наяўнасць таннай, дармавой прыгоннай працы не стымулявала ўвядзення машын, пераходу да шматполля, паляпшэння пароды жывёлы.

Галоўны сродак павелічэння колькасці вырошчваемай прадукцыі на продаж — гэта ўзмацненне прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Формы эксплуатацыі, якім падвяргаюцца яны ў гэты час,— баршчына і аброк, што іншы раз перапляталіся паміж сабой. У Беларусі паншчынныя сяляне складалі 92,4 % ад агульнай колькасці прыгонных. Памешчыкі часта прымушалі працаваць на паншчыне ўсе дні тыдня, апрача нядзелі. У такіх умовах большасць сялянскіх гаспадарак прыходзіла ў заняпад. Сялян перасялялі на неўрадлівыя землі, адразалі частку іх зямлі або зусім пазбаўлялі надзелаў. Многія станавіліся агароднікамі (халупнікамі), якім давалі толькі сядзібы, або бабылямі (кутнікамі), у якіх не было не толькі зямлі, але і нават свайго жылля. Вялікую групу сялян складалі месячнікі, у якіх не было зямельнага надзелу. Яны атрымоўвалі мізэрнае месячнае ўтрыманне за работу ў двары феадала. Месячнікі апрацоўвалі зямлю прыладамі працы памешчыка, але перавод прыгонных сялян на месячыну зусім не азначаў ператварэння іх у наёмных рабочых, наадварот, яны былі фактычна пастаўлены ў становішча рабоў. Колькасць праслойкі немаёмных і пазбаўленых зямлі сялян у 50-я гг. XIX ст. у цэнтральнай і заходняй Беларусі дасягала 7—9 % двароў.

Пазбаўленне работніка сваёй зямлі падрывала асновы феадальнай сістэмы гаспадарання, пры якой ён надзяляўся сродкамі вытворчасці і павінен быў забяспечваць узнаўленне рабочай сілы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Аврех А. Я. Вопрос о западном земстве и банкротство Столыпина // Исторические записки АН СССР. М., 1961. Т. 70. С. 61—112.
2. Бейлькін Х. Ю. Асаблівасці правядзення рэформы 1861 г. у Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2001 № 4.
3. Белоруссия в эпоху капитализма. Мн., 1983. Т. 1.
4. Біч М. В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст.— 1917 г.: Вучэб. дапам. для вучняў 8 кл агульнаадукац. шк. Мн., 1998. С. 82—93, 206—222.
5. Біч М. В. Станаўленне буржуазнага грамадства // Нарысы гісторыі Беларусі. Мн.. 1994. Ч. 1. С. 303—319.
6. Великая реформа. Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем. М., 1911. Т. 2.
7. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861—1917 гг.). Мн., 1972.
8. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мн., 2002.
9. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 — 1903): У 4 т. Т. 2. Мн., 1940.
10. Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
11. Дружинин Н. М. Русская деревня на переломе (1861—1880 гг.). М., 1978.
12. Есин Б. И. Русская журналистика 70—80-х гг. XIX в. М., 1963.
13. Жытко А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг. Мн., 2003. С. 75.
14. Забаўскі М. М. Грамадска-палітычная барацьба ў сувязі з увядзеннем земстваў у Беларусі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1987. № 1. С. 61—69.
15. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). Мн., 1999. С. 100—121.
16. Зайнчковский П. А. Военные реформы 1860—1870-х годов в России. М., 1952.
17. Зайнчковский П. А. Отмена крепостного права в России. М., 1954.
18. Зайнчковский П. А. Проведение в жизнь крестьянской реформы. М., 1958.
19. Захаров Л. Г. Самодержавие и отмена крепостного права в России. М., 1984.
20. З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі: Вуч.-метад. зб. Мн., 1997. Вып. 2. С. 35—56.
21. Кагачэўская Т. Аб дзейнасці Магілёўскага земства ў галіне народнай адукацыі // Адукацыя. Гісторыя. Мова: Тэмат. зб. навук. прац па беларусазнаўству. Брэст, 1992. С. 33—36.
22. Каліноўскі К. За нашу вольнасць: Творы, дакументы. Мн., 1993.
23. Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 5. С. 35.
24. Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. Мн., 1971.
25. Липинский Л. П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978.
26. Литвак Б. Г. Переворот 1861 г. в России: почему не реализовалась реформаторская альтернатива. М., 1991.
27. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1898/99 уч. г. Вильна, 1899. Ч. 2.

28. Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990.
29. Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 2003. С. 209—211.
30. Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн.. 1986.
31. Слабажанін В. П. Да гісторыі ўвядзення земства ў Беларусі (1864—1911 гг.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1987. № 4. С. 73—80.
32. Сорокина В. В. Политика русского самодержавия в отношении западных земств // Правоведение. 1979. № 1. С. 70—76.
33. Талмачова С. А. Сялянскае самакіраванне ў Беларусі (1861—1901 гг.). Аўтарэф... канд. гіст. навук. Мн., 2002. С. 11—12; 15—16.
34. Троицкий Н. А. Россия в XIX веке. Курс лекций. М., 1997. С. 194—242.
35. Уланов В. Я. Ход и исход крестьянской реформы. // Великая реформа: Сб. ст. М., 1911.
36. Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965.
37. Фрыдман М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн.,1958.
38. Шабуня К. И. Аграрный вопрос в крестьянском движении в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962.
39. Эканамічная гісторыя Беларусі: Курс лекцый. Мн., 1995.
40. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993. Т. 1. С. 109—110.
41. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 2001. Т. 6. Кн. 1. С. 465—466.

## ЗМЕСТ

Уступ ........ 3
1. Аграрныя рэформы: вызваленне сялян і вырашэнне пытання аб зямлі ........ 5
*1.1. Падрыхтоўка адмены прыгону* ........ 5
*1.2. Маніфест і «Палажэнні» ад 19 лютага 1861 г* ........ 15
*1.3. Змены ў «Палажэннях» у сувязі з паўстаннем 1863 г* ........ 19
*1.4. Рэформы для дзяржаўных сялян, вольных людзей, сельскіх чыншавікоў і іншых катэгорый сялянскага насельніцтва* ........ 23
2. Культурна-адукацыйныя рэформы: універсітэцкая, школьная і цэнзурная ........ 28
3. Палітычныя рэформы: увядзенне мясцовага самакіравання, рэформы суда і арміі, гарадская рэформа ........ 32
4. Контррэформы ў 90-я гг. XIX ст ........ 36
5. Урадавыя рэформы ў пачатку XX ст ........ 38
*5.1. Нарастанне рэвалюцыйнай сітуацыі. Вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг* ........ 38
*5.2 Сталыпінская аграрная рэформа ў Беларусі* ........ 43
*5.3. Трэцячэрвеньская палітычная сістэма. Увядзенне земства ў заходніх губернях* ... 46
Дадатак ........ 53
Літаратура ........ 62

Вучэбнае выданне

Забаўскі Мікалай Міхайлавіч,
Рацько Аляксандр Фёдаравіч

**БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ У БЕЛАРУСІ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.**

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

*Рэдактар Л. М. Каранеўская*
*Тэхнічнае рэдагаванне* А. А. Пакалы
*Камп'ютэрная вёрстка* А. М. Ахрэмчык, А. А. Пакалы

Падпісана ў друк 09.02.04. Фармат 60x84 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура *Арыял*.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 3,7. Ул.-выд. арк. 5,8. Тыраж 100 экз. Заказ 796

*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.03. 220050, Мінск, Савецкая, 18

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:* Вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ.
Ліцэнзія ЛП № 486 ад 02.04.02. 220007, Мінск, Маплёўская, 37.